«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

«Надыдзе час — і не будуць кідаць у турмы». Трох жанчын асудзілі за падзеі 6 верасня ў Гродне

16.08.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед

Тром гарадзенкам — Ганне Мароз, а таксама Але Гарацкевіч і яе дачцэ Галіне — 16 жніўня вынеслі прысуд. Суддзя суда Кастрычніцкага раёна Гродна Максім Галубовіч прызнаў усіх вінаватымі.



Галіна Гарацкевіч і Ганна Мароз у перапынку паміж судовымі пасяджэннямі

Жанчын судзілі за ўдзел у пратэсным маршы ў Гродне на вуліцы Гарнавых 6 верасня 2020 года. Іх вінавацілі па двух крымінальных артыкулах: ч. 1 арт. 342 КК РБ (Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і звязаныя з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады ці якія пацягнулі парушэнне працы транспарту), а таксама арт. 364 КК РБ (Гвалт або

пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў). У прысудзе суддзя пераквалiфікоўваў артыкул 364 КК РБ на частку 2 артыкула 363 КК РБ (Супраціў супрацоўніку органаў унутраных спраў пры выкананні ім абавязкаў па ахове грамадскага парадку). І ў сукупнасці па двух артыкулах прызначыў усім тром жанчынам пакаранне:

- **Ала Гарацкевіч — 2 гады і 6 месяцаў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хатняя хімія»);**

- **Галіна Гарацкевіч — 3 гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу;**

- **Ганна Мароз — 4 гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.**



“Натхнялі сваім паводзінамі навакольных”. Стала вядома, у чым абвінавачваюць трох гарадзенак, суд над якімі пераносіўся двойчы

Працэс над імі пачынаўся 6 траўня, а таксама 14 чэрвеня, але быў перанесены праз сур'ёзную хваробу адной з абвінавачваных. На судовым пасяджэнні 28 чэрвеня жанчынам зачыталі абвінавачванне, а 11 пацярпелых так і не з'явіліся.



Тром гарадзенкам запатрабавалі «хімію», а амапаўцы «чакаюць прыезду кіраўніка дзяржавы». Што адбывалася на судовым працэсе над Гарацкевічамі і Мароз?

Адна з абвінавачваных пазнала ў асобе сведкі-супрацоўніка УУС свайго суседа. Пацярпелыя амапаўцы не прыйшлі на спрэчкі бакоў, бо сёння ахоўваюць адкрыццё моста ў Гродне. Але сведкі-кіроўцы грамадскага транспарту былі знятыя з працы дзеля ўдзелу ў чарговым судовым працэсе.

Галіна Гарацкевіч і Ганна Мароз падчас судовага следства знаходзіліся пад вартай. Пасля абвяшчэння прысуду меру стрымання ў дачыненні да іх змянілі. Каля паўсотні чалавек прыйшло, каб падтрымаць жанчын падчас вынясення прысуду.

У той жа дзень, 16 жніўня, жанчыны выступілі з апошнім словам. А на судовым пасяджэнні 13 жніўня іх абарона агучыла сваю пазіцыю на спрэчках бакоў. «Вясна» прыводзіць іх словы ніжэй.

Галіна Гарацкевіч

Пазіцыя абароны ў спрэчках бакоў

Абарона Галіны Гарацкевіч пачала свой выступ са словаў:

> *«Хто знаходзіцца на лаве абвінавачваных? Гэта нашы грамадзянкі Рэспублікі Беларусь… Адна з іх маці, выхавала дзіця. Але так атрымалася, што яе дзіця цяпер знаходзіцца — непрыгожа скажу — але за кратамі [маецца на ўвазе Ала Гарацкевіч, дачка якой, Галіна Гарацкевіч, знаходзіцца пад вартай — Заўв.]. Другая жанчына — таксама маці, якая выхоўвае дзіця [Ганна Мароз]. І трэцяя, вядома, мая кліентка. Яна, я спадзяюся, таксама ў будучыні будзе мамай. Гэта ўсё нашы жанчыны, якія робяць нашу будучыню. Як можна цяпер нас пазбаўляць нашай будучыні?»*

Абарона звярнула ўвагу на Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, якую падпісала і Беларусь, а менавіта на артыкул 20, дзе сцвярджаецца права чалавека ўдзельнічаць у мірных масавых мерапрыемствах.

> *«Вось гэтыя цудоўныя жанчыны выйшлі на вуліцу. Як сказала Ганна Мароз: "Я выйшла выказаць сваё меркаванне". Яны не неслі з сабой палкі ў руках. Аднак пацярпелыя [амапаўцы] выказалі, што [абвінавачваныя] праяўлялі агрэсію. БЧБ-сцяг і шарыкі — гэта хіба агрэсія?!»*

Абарона адзначыла, што складу злачынства па артыкуле 364 КК РБ (гвалт) няма.

> *«Крохкія жанчыны не наносілі пабоі пацярпелым. Не заміналі праезду, проста ішлі на пл. Савецкую, а ім перагарадзілі тратуар супрацоўнікі міліцыі. Яны выпадкова трапілі наперад і не змаглі выйсці… Але тых, хто ішоў наперадзе, ціснулі тыя, хто ішоў ззаду. Намеру ў абвінавачваных не было на прычыненне гвалту».*

Абвінавачваныя не аказвалі процідзеяння міліцыянерам. Бо тыя не падалі ніводнага рапарту пра гэта, і ніхто не звярнуўся да лекара. Абарона мяркуе, што пацярпелыя **Базылевіч** і **Вавілонаў** не павінны быць пацярпелымі па гэтай справе, бо яны давалі паказанні пра тое, што адбывалася побач з універсамам "Брэст", а не на вуліцы Гарнавых (за што абвінавачваных і судзяць).



Людзі, якія прыходзілі на суд, каб падтрымаць Гарацкевічаў і Мароз

Акрамя таго, пазначаная сума шкоды Гарадзенскаму аўтапарку і Тралейбуснаму ўпраўленню з'яўляецца няслушнай, бо гэта сума пададзеная бухгалтэрыяй за ўвесь дзень "прастою" 6 верасня (а ў абвінавачванні пазначаны час з 13.20 да 17.00). Таму складу злачынства па ч. 1 арт. 342 КК РБ таксама няма. Людзі проста ішлі на пл. Савецкую па тратуары, Галіна Гарацкевіч ні разу не выйшла на праезную частку.

У сувязі з гэтым абарона Галіны Гарацкевіч прасіла апраўдаць яе па двух артыкулах цалкам.

Апошняе слова Галіны Гарацкевіч

У сваім апошнім слове Галіна Гарацкевіч звярнулася да сваіх родных і сяброў:

> *«Дзякуй за тое, што прыходзіце на судовыя пасяджэнні, за тое, што пішаце лісты — і ў іх шмат падтрымкі і цяпла. За рэгулярныя перадачы дзякуй вялікі. Дзякуй, што падтрымліваеце маму, калі мяне няма побач з імі. Вы ўсе падмацавалі маю веру ў чалавечнасць. Я радая, што мяне атачаюць людзі з вялікай літары. Дзякуй!»*



Галіна Гарацкевіч пасля прысуду (у цэнтры) і яе маці Ала Гарацкевіч (справа)

***Галіна Гарацкевіч атрымала 3 гады абмежавання волі з накіраваннем ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.**

Ганна Мароз

Пазіцыя абароны ў спрэчках бакоў

Абарона Ганны Мароз прасіла суд апраўдаць яе цалкам, паколькі доказаў віны падабароннай няма, а яе абвінавачванне па двух артыкулах носіць агульны характар. Ганна часткова прызнала віну — аднак толькі ў тым, што ёй не было вядома пра несанкцыянаванасць масавага мерапрыемства. Яе падхапіў натоўп, намеру на гвалт яна не мела. З паказанняў 11 пацярпелых, апытаных у закрытым парадку (яны былі залегендаваныя), нельга канкрэтызаваць віну Ганны. Бо пацярпелыя нават і сябе часта не пазнавалі на відэа, іх паказанні супярэчлівыя. А з аналізу відэа бачна, што Мароз лозунгаў не выкрыквае, атрыбутыкі няма. Яна была зацiснутая з двух бакоў і не аказвала процідзеяння міліцыі. Мароз не выкарыстоўвала жэсты і лозунгі, міліцыянерам не пагражала, рух транспарту не блакавала. Апытаныя кіроўцы гарадскога транспарту не казалі пра блакаванне дарог.

Мароз не ўступала ў змову з Гарацкевічамі (артыкул 342 КК РБ кажа пра групавыя дзеянні — Заўв.), іх яна ўбачыла ўпершыню на судовым пасяджэнні, распачатым у траўні.

Акрамя таго, абарона звярнула ўвагу і на жыццёвую гісторыю Ганны Мароз: яе першы муж загінуў, у яе двое малых дзяцей 2006 і 2011 года нараджэння. Адна з дзяўчынак цяжка хворая.

Апошняе слова Ганны Мароз:

> *«Я была пераканана, што свет не стаіць на месцы. [неразб.] Стаялая вада і плынь. Першая гніе і ператвараецца ў балота. Другая ператвараецца ў крыніцу, а з крыніцы ператвараецца ў ручай, раку, мора. Я ведаю, што свет ідзе наперад [неразб.]. Назіраючы за людзьмі, я разумею: то, да чаго яны ідуць, лепш. Новае пакаленне ніяк не можа быць горшае за папярэдняе. Маладыя людзі аналізавалі памылкі. І трэба быць поўным дурнем, каб не заўважаць гэтага. Кожны з нас выяўляе сабе шчасце. А якімі сродкамі мы карыстаемся, каб дасягнуць мэты? Што мы разумеем пад шчасцем? Дамагаемся яго толькі для сябе ці дамагаемся для ўсіх? На жаль, часцей за ўсё для сябе. І каб дасягнуць яго, забіваем у сабе чалавека. А чалавекам з'яўляецца той, хто [неразб] сабе роўныя правы да шчасця для ўсіх людзей. Я веру, надыдзе час — і не будуць кідаць у турмы [неразб]. Не будзе нават слова "свабода". Не будзе нават слова "праўда". Таму што і тое, і другое будзе звыклым...»*

Ганна Мароз атрымала 4 гады абмежавання свабоды без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.



Ганна Мароз пасля прысуду

Ала Гарацкевіч

У спрэчках бакоў абарона Алы Гарацкевіч далучылася да меркавання іншых абаронцаў.

> *«Абвінавачванні ўсім траім аднолькавыя, толькі прозвішчы перастаўлены ў абвінавачванні. Абвінавачваным інкрымінавалі дзеянні, не канкрэтызуючы іх, падагульніўшы арт. 342 і арт. 364 КК РБ».*

Абарона адзначыла, што Алу Гарацкевіч на відэа не ідэнтыфікавалі. Доказаў яе віны няма, экспертыз няма, паказанняў сведкаў таксама няма. Пацярпелыя не пазнаюць сябе і абвінавачваных. Нават калегаў не могуць назваць, што выклікае сумнеў, што яны наогул знаходзіліся на вуліцы Гарнавых. Пяць з адзінаццаці пацярпелых не давалі паказанняў на папярэднім следстве, што знаходзіліся на вул. Гарнавых — а на судовым пасяджэнні патлумачылі гэта тым, што нібы следчы тады не запісаў іх паказанні. Гэта выклікае вялікія сумневы.

У абвінавачванні пазначана, што тры абвінавачваныя нібы выштурхвалі амапаўцаў. Аднак, адзначыла абарона, Але Гарацкевіч 58 гадоў, яна выгадавала дваіх дзяцей і цяпер цяжка хворая (жанчына захварэла на анкалогію пасля завядзення крымінальнай справы — праз гэта яе, у адрозненне ад яе дачкі Галіны і Ганны Мароз, не змясцілі пад варту, а судовы працэс пераносіўся двойчы).

Таму абарона лічыць, што абвінавачванні па двух артыкулах не знайшлі свайго пацвярджэння, і прасіла апраўдаць Алу Гарацкевіч.

У сваім апошнім слове Ала Гарацкевіч падзякавала ўсім, хто прыйшоў, за падтрымку..




За судовым працэсам назіраў праваабаронца ***Раман Юргель****.*

Опубликовать



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ



Праваабаронца Наталля Сацункевіч: "Задача грамадскіх назіральнікаў — прымусіць сістэму выконваць правілы"


У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Заява аб прызнанні 13 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жанчыну асудзілі па фота з Маршаў, якія захаваліся на воблачным сховішчы яе тэлефона

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА






Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 27 сакавіка па 11 красавіка

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 12 па 27 сакавіка

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

"Гэтыя каштоўнасці не прыбраць". Як экс-палітвязні святкавалі Дзень волі ў няволі




ГАЛОЎНАЕ

Праваабаронца Наталля Сацункевіч: "Задача грамадскіх назіральнікаў — прымусіць сістэму выконваць правілы"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

У брэсцкім СІЗА памёр Аляксандр Кулініч, якога абвінавачвалі ў абразе Лукашэнкі

"Следчая адвярнулася да сцяны і заплакала". Гісторыя пенсіянера, якога асудзілі па даносе суседа за ўдзел у пратэстах

Затрыманні журналіста, прадпрымальніка, старшыні АСВОДа: хроніка пераследу 13-15 красавіка (дапоўнена)

Зорку "Што? Дзе? Калі?" Фёдара Шведава ў Гродне судзяць за данаты (дапоўнена)

У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Музыкаў гурта Nizkiz асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі"

Заява аб прызнанні 14 чалавек палітычнымі зняволенымі


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

Kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre
memorial

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

